НАДВОР'Е

НА ВАДОХРЫШЧА ПАЦЯПЛЕЕ

Сёлета традыцыйныя вадохрышчанскія маразы адмяняюцца. Хоць і разгар зімы, але адзначаецца цёплае надвор'е. Сярэднясутачная тэмпература паветра на 1—5 °С перавышае кліматычную норму, а ападкі ў асноўным у выглядзе дажджу. Снежнае покрыва паступова і паўсюдна знікае, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Пры паступленні цёплага і вільготнага паветра месцамі па краіне будуць згушчацца туманы. Асобныя ўчасткі дарог будуць слізкімі, папярэдзілі ў Белгідрамеце.

У пятніцу чакаецца пераважна воблачнае надвор'е. Тэмпература паветра на працягу сутак ад нуля да плюс 4 °С.

А на выхадныя ноччу злёгку прымарозіць, а днём пацяплее. Такім чынам, 18 і 19 студзеня тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца пад уплывам цёплых паветраных мас атлантычнага паходжання, якія паступаюць па перыферыі шырокага антыцыклону, цэнтр якога будзе перамяшчацца з Польшчы на Карпаты. Воблачна з праясненнямі. Пераважна без ападкаў. У асобных раёнах слабы туман; ноччу і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер заходні, паўночна-заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 3 °С, а максімальная днём складзе плюс 1—7 °С.

Аналагічная тэмпература будзе і ў панядзелак, і ў аўторак. Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, да сярэдзіны наступнага тыдня сітуацыя зменіцца. Да серады з Заходняй Еўропы на тэрыторыю нашай краіны зрушыцца франтальны раздзел, які прынясе не толькі ападкі, але і больш халаднаватую паветраную масу. Тэмпературны фон пачне паніжацца, а ападкі будуць адзначацца ў выглядзе дажджу з мокрым снегам.

У сераду ноччу і раніцай чакаюцца месцамі слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 °С да плюс 2 °С, удзень — ад мінус 1 °С да плюс 4 °С.

Сяргей КУРКАЧ.

АНОНС

САМААДДАЧА Ў ПРАФЕСІІ, ЗНАХОДКІ АРХЕОЛАГАЎ, ЗДАРОЎЕ І МОДА

Пра што раскажа часопіс «Алеся» ў студзені?

ЛЮБОЎ СІДЗЕЛЬНІКАВА: ВАЖНА НЕ БАЯЦЦА ПРАЯЎЛЯЦЬ СЯБЕ

За гады сваёй працы галоўны мастак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Любоў Сідзельнікава афарміла дзясяткі спектакляў у розных калектывах. Яна — чалавек вялікай творчай самааддачы.

Любоў Сідзельнікава расказала «Алесі» пра любоў да справы, якасцях, якія павінен мець чалавек яе прафесіі, пра сяброўства паміж творцамі і пра іншае.

ВЯРТАННЕ СТРАЧАНАГА

Якія сенсацыйныя знаходкі адшукалі падчас раскопак на рацэ Менка? Як гэта змяняе нашы ўяўленні пра гісторыю Мінска? У чым шчасце археолага? Якія «дэфармацыі» развіваюцца з часам у людзей гэтай прафесіі? Пра гэта і не толькі — у гутарцы «Алесі» з загадчыкам аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдатам гістарычных навук,«Мінчанінам года — 2023» Андрэем Вайцяховічам.

ЧАМУ ВАЖНА ХАРЧАВАЦЦА ПРАВІЛЬНА?

Якія хваробы органаў стрававання пераважаюць у жыхароў нашай краіны? Як звязаныя паміж сабой страўнікава-кішачны тракт і імунітэт? Пры якіх сімптомах трэба, не адкладаючы на доўгі час, звяртацца да дактароў? Пра гэта расказала часопісу «Алеся» кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры тэрапіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя БДМУ Жанна Сухіх.

ЗДАРОЎЕ, ГІД ПА МОДНЫХ ТРЭНДАХ І ВІНТАЖ У ІНТЭР'ЕРЫ

У студзеньскім нумары «Алеся» расказвае пра тое, як не паддацца

сезонным захворванням — вострым рэспіраторным вірусным інфекцыям, а таксама пра карысць хурмы і ежу, якая саграваe ў халодны сезон. Нашых чытачоў зацікавяць парады па стварэнні арыгінальнага інтэр'ера з дапамогай вінтажных рэчаў і гід па трэндах у макіяжы, прычосках і адзенні.

Алена ВАЛЕР'ЕВА.

17 СТУДЗЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

1732 год — нарадзіўся (в. Воўчын, цяпер у Камянецкім раёне) Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, апошні кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1764—1795).

1904 год — нарадзіўся (в. Чурылава, цяпер Уздзенскі раён) Алесь Якімовіч, беларускі празаік, паэт, перакладчык. Друкавацца пачаў у 1923 годзе (часопіс «Маладняк»). Першая кніга «Вершы» выйшла ў 1925 годзе. Пісаў пераважна для дзяцей. У апрацоўцы Якімовіча асобнымі выданнямі выйшла шмат беларускіх казак, а таксама зборнікі «Каток — залаты лабок», «Бацькаў дар», «З рога ўсяго многа», «Андрэй за ўсіх мудрэй» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

У свеце

1209 год — заснаваны Кембрыджскі ўніверсітэт, па часе заснавання другі ўніверсітэт у Вялікабрытаніі пасля Оксфардскага і чацвёрты ў свеце; адзін з найбольш вядомых універсітэтаў свету, член элітнай Групы Расэл. Сярод людзей, так ці інакш звязаных з Кембрыджскім універсітэтам, 87 нобелеўскіх лаўрэатаў — па гэтым паказчыку ён займае адно з першых месцаў сярод вышэйшых навучальных устаноў свету.

1945 год — савецкія войскі ў ходзе Варшаўска-Познаньскай аперацыі вызвалілі Варшаву, ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

1991 год — войскі міжнароднай кааліцыі пачалі баявую аперацыю па вызваленні Кувейта пад назвай «Бура ў пустыні», якая паспяхова завяршылася 24 лютага 1991 года. З 17 студзеня да 24 лютага праводзілася так званая бескантактавая фаза: масіраваныя ўдары з паветра, а 24—28 лютага прайшла наземная аперацыя, якая завяршылася вызваленнем Кувейта і ўзнаўленнем status quo.

«Чытаць з намі — утульна!»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» ці на газету «Літаратура і мастацтва» на I квартал або на I паўгоддзе 2025 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце яе і дасылайце да 22 студзеня 2025 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем канвектараў Edisson Polo 1500 M і суперпрыз — маслены радыятар Neoclima NC 9309. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 5 лютага 2025 года.

Прызы можна будзе атрымаць да 31 сакавіка 2025 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» або «Літаратуру і мастацтва» на I квартал ці на I паўгоддзе 2025 года. Пасля 31 сакавіка 2025 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ад падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў «Звяздзе» ад 29 лістапада 2024 года, № 233.

Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4265 ад 1.12.2022 г.
выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» або «ЛіМа» на I квартал або на I паўгоддзе 2025 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)
на I квартал або на I паўгоддзе 2025 года

Хатні адрас і тэлефон *(абавязкова)* _____ *(індэкс)* _____

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 12 851. Індэкс 63850. Зак. № 82. Нумар падпісаны ў 19.30 16 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12